# Купалле ў скансэне

***Напрыканцы чэрвеня ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту адбылося Купалле – адно з самых старажытных каляндарна-абрадавых святаў беларусаў. Супрацоўнікі музея разам са студэнтамі кафедры этналогіі і фальклору БДУ культуры і мастацтваў прапанавалі ўсім ахвочым адзначыць Купалле на тэрыторыі скансэна на ўзор яго святкавання на беларускім Падняпроўі і Палессі.***



Наведнікі музея пачулі купальскія песні, якія выконваліся ў аўтэнтычнай манеры спявання вясковых спевакоў, і традыцыйную беларускую інструментальную музыку ў жывым выкананні, патанчылі традыцыйныя беларускія танцы, павадзілі карагоды вакол купальскага вогнішча і пагулялі ў купальскія гульні.

Атмасферу свята стварылі выдатныя фальклорныя калектывы – удзельнікі шматлікіх святаў і фестываляў традыцыйнага беларускага мастацтв «Вяснянка», «Этнасупо ка», «Верас», «Ветах», «С нічка».

*Ларыса САЛОДКІН*
*Фота аўта*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ